УДК 378.094.3:01]:023.5-057.875

***С. В. Зыгмантовіч,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці;*

***В. І. Саітава,***
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт, прафесар кафедры інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

# ГАРМАНІЗАЦЫЯ МЕТАДАЛАГІЧНЫХ ПАДЫХОДАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ АГУЛЬНАБІБЛІЯГРАФІЧНЫХ ВУЧЭБНЫХ ДЫСЦЫПЛІН

**Анатацыя.** Разглядаюцца сучасныя метадалагічныя падыходы да функцыянавання бібліяграфіі як грамадскай з'явы (сацыяльнага інстытута) – гуманістычны і інфармацыйна-тэхнакратычны. На прыкладзе выкладання агульнабібліяграфічных дысцыплін абгрунтоўваецца неабходнасць іх гарманічнага раскрыцця і выкарыстання пры вызначэнні зместу, формаў і метадаў адукацыйнай дзейнасці ў працэсе падрыхтоўкі бібліятэчна-інфармацыйных спецыялістаў.

**Ключавыя словы:** бібліяграфія, падрыхтоўка бібліятэчна-інфармацыйных кадраў, агульнабібліяграфічныя дысцыпліны, метадалагічныя падыходы выкладання.

***S. Zygmantovich,***
*Candidate of Pedagogical Sciences, Associate Professor, Professor of the Department of Information and Analytical Activity of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts";*

***V. Saitava,***
*Candidate of Pedagogical Sciences, Associate Professor, Professor of the Department of Information and Analytical Activity of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts"*

# HARMONIZATION OF METHODOLOGICAL APPROACHES IN THE TEACHING OF GENERAL BIBLIOGRAPHY COURSES

**Abstract.** The article considers modern methodological approaches to the functioning of the bibliography as a social phenomenon (social institution) - humanistic and information-technocratic. The authors justify the need for their harmonious disclosure and use in determining the content, forms and methods of educational activities in the process of training library and information specialists on the example of teaching general bibliographic disciplines.

**Keywords:** bibliography, training of library and information staff, general bibliographic disciplines, methodological approaches to teaching.

Вывучэнне дысцыплін агульнага бібліяграфазнаўства ў межах спецыяльнасці «Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць» накіравана на фарміраванне прафесійнага светапогляду і кампетэнтнасці бібліятэчных спецыялістаў. Праз комплекс дысцыплін агульнага бібліяграфазнаўства – «Бібліяграфазнаўства. Тэорыя», «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя», «Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы» – студэнты паслядоўна спасцігаюць веды аб прасторы існавання бібліяграфіі і яе функцыянальным патэнцыяле. У наш час дадзеная прастора надзвычай складаная – гэта суіснаванне аналагавых (дакументальных) і лічбавых камунікацый, якія сутнасна розныя.

Аналіз навуковых падыходаў да вывучэння бібліяграфіі, асноўных фактараў, якія ўплываюць на бібліяграфічную дзейнасць, яе прынцыпаў, што змяняюцца ў канкрэтна-гістарычных умовах, ставіць перад выкладаннем агульнабібліяграфічных вучэбных дысцыплін пытанні: які кірунак асвятлення маштабаў і ролі бібліяграфіі як грамадскай з’явы павінен выступаць дамінуючым? у якіх ракурсах раскрываць спецыфіку бібліяграфічнага сацыяльнага інстытута, каб у студэнтаў склалася адпаведнае сучаснасці ўяўленне пра бібліяграфію ў кантэксце ўяўленняў аб яе эвалюцыі і яе місіі ў будучым?

Дасягненні навуковай думкі, бібліяграфічнай практыкі і педагагічны вопыт выкладання агульнабібліяграфічных вучэбных дысцыплін прывялі нас да наступных высноў.

Змястоўнае напаўненне і структураванне вышэйназваных вучэбных дысцыплін ажыццяўляюцца з улікам мегатэндэнцый глабалізацыі і інфарматызацыі (зараз дыгіталізацыі), якія яшчэ нядаўна палярызавалі канцэптуальныя падыходы да бібліяграфіі паміж гуманістычнай арыентацыяй і тэхнакратычнай перспектывай. А. В. Сакалоў і Т. Ф. Берастава адзначалі, што вышэйназваныя мегатэндэнцыі праявіліся ў агульнай дэгуманізацыі сучаснага грамадства і прывялі да антрапалагічнага крызісу, абвастрылі рызыкі для бяспекі жыцця чалавечага грамадства [6]. Сёння апазіцыя «гуманізм – тэхнакратызм» страціла спрошчаныя трактоўкі і патрабуе гарманізацыі гэтых канцэптаў, першы з якіх традыцыйна звязаны з адлюстра-

ваннем ролі бібліяграфіі як грамадскай з'явы, другі ў апошнія дзесяцігоддзі праяўляецца ў інтэнсіўнай дыгіталізацыі бібліяграфічных працэсаў, прадукцыі, сэрвісаў і паслуг ва ўсіх сацыяльных інстытутах і сферах функцыянавання бібліяграфіі. Бібліяграфія, інфармацыйная па сваёй прыродзе, з развіццём дыгіталізацыі раскрывае новыя магчымасці ў мадэляванні патокаў і масіваў фіксаваных ведаў, стварэнні спецыфічных інфармацыйна-пошукавых сістэм, у функцыянаванні электронных бібліятэк, паўнатэкставых баз даных, у тэхналогіях доступу да дакументаў, тэкстаў, любых квантаў ведаў, якія атрымалі бібліяграфічную апрацоўку, незалежна ад іх лакалізацыі ў інфармацыйнай прасторы.

Праблема суадносінаў гуманізму і тэхнакратызму прызнана актуальнай для бібліяграфічнай практычнай дзейнасці і бібліятэчна-бібліяграфічнай адукацыі. Гэта падкрэслена ў ходзе дыскусіі, праведзенай часопісам «Университетская книга» ў 2013 г., у публікацыях уплывовых даследчыкаў А. В. Сакалова [6], В. К. Сцяпанава [7], Ю. М. Сталярова [8], Н. І. Гендзінай [1].

Гэтая праблема для сістэмы адукацыі не страчвае сваёй актуальнасці і ў цяперашні час. У выніках праведзенага ў Беларусі рэспубліканскага даследавання на тэму «Разработать компетентностную модель выпускника учреждения высшего образования по специальности "Библиотечно-информационная деятельность" на основе изучения требований организаций–заказчиков кадров», адной з мэтаў якога выступала вывучэнне міжнароднага вопыту ў галіне бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі і змяненняў у патрабаваннях заказчыкаў кадраў, была адзначана сярод асноўных тэндэнцыя трансфармацыі гуманістычнай парадыгмы бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі ў тэхнолага-тэхнакратычную, што праяўляецца ў вызначэнні кампетэнцый і вынікаў навучання [4, с. 211].

Вызначэнне пазіцыі прадстаўнікоў беларускіх бібліятэк – заказчыкаў кадраў аб перспектыўным вектары падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў у эпоху лічбавых тэхналогій па выніках рэспубліканскага даследавання «Исследовать тенденции и пути развития библиотечно-информационного образования в век цифровых технологий» дазволіла высветліць наступныя меркаванні. Грунтуючыся на сваім прафесійным і адміністра-

цыйным досведзе, абсалютная большасць рэспандэнтаў анкетнага апытання (92,1%) лічыць, што развіццё лічбавых тэхналогій дыктуе змену прыярытэтаў у падрыхтоўцы будучых спецыялістаў. Але ў практыкаў няма кансалідаванага меркавання адносна перспектыўнага вектара падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў. Разам з тым абсалютная большасць рэспандэнтаў адзначылі неабходнасць полідысцыплінарнай падрыхтоўкі без прыярытэтных напрамкаў – 42,1 %; сацыяльную накіраванасць – 26,3 %; інфармацыйна-тэхналагічны вектар у якасці прыярытэтнага – 18,4 %; гуманітарны – 10,5 % [2, с. 92; 3, с. 325]. Адказы на аналагічнае пытанне выкладчыкаў факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый універсітэта таксама паказалі адсутнасць адзінства: 35 % аддалі перавагу інфармацыйна-тэхналагічнаму фокусу падрыхтоўкі; 25 % падтрымліваюць ідэю полідысцыплінарнай падрыхтоўкі; 20 % вызначылі сацыяльны вектар; 5 % – гуманітарны [3, с. 265].

Атрыманыя даныя і роскід меркаванняў экспертаў, прадстаўнікоў установы вышэйшай адукацыі адлюстроўваюць існуючыя ў бібліятэказнаўстве і ў свядомасці спецыялістаў сучасныя праблемы метадалагічнага характару аб прафесійнай ідэнтычнасці бібліятэчнай прафесіі.

На нашу думку, у сістэме бібліятэчна-інфармацыйнай адукацыі апазіцыя «гуманізм – тэхнакратызм» у наш час патрабуе рацыянальнага і гарманічнага адлюстравання абодвух кампанентаў у структуры ўніверсальных і прафесійных кампетэнцый, якія фармуюцца ў будучых бібліятэчных спецыялістаў. У яе вырашэнні агульнабібліяграфічныя дысцыпліны вылучаюцца выразнымі адрознымі характарыстыкамі.

Фармаванне гуманістычных каштоўнасцяў будучых спецыялістаў ажыццяўляецца як з улікам аб’екта і прадмета агульнабібліяграфічных вучэбных дысцыплін, так і выбару метадаў і формаў навучання, асобага акцэнту пры іх праектаваннні на неабходнасць засваення пэўнага зместу сучасных бібліяграфазнаўчых канцэпцый, мэтавую накіраванасць, суб’ектнасць бібліяграфічнай практычнай дзейнасці.

Немагчыма прымяніць гуманістычныя каштоўнасці без уліку аб’екта і прадмета агульнабібліяграфічных вучэбных дысцыплін. Падмурак гуманістычнага светапогляду студэнтаў закладваецца пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны «Бібліягра-

фазнаўства. Тэорыя». Менавіта ў гэтай дысцыпліне студэнты далучаюцца да пазнання гуманістычных каштоўнасцяў бібліяграфіі: яе місіі, мэт, ролі ў захаванні і трансляцыі на другаснадакументальным узроўні фіксаваных ведаў, назапашаных чалавецтвам, нацыямі ці лакальнымі, асобнымі сацыяльнымі, прафесійнымі ўтварэннямі. Таму ў вучэбнай праграме дысцыпліны прыярытэтная ўвага надаецца раскрыццю ролі бібліяграфіі ў грамадстве: інфраструктурнай місіі бібліяграфіі ў задавальненні інфармацыйных патрэбнасцяў усіх магчымых катэгорый карыстальнікаў у розных сферах іх дзейнасці, бібліяграфічнай інфармацыі як віду сацыяльнай інфармацыі, унікальным магчымасцям бібліяграфічнай інфармацыі ў згортванні, мадэляванні і структураванні дакументаваных ведаў чалавецтва. У цэнтры бібліяграфічнай сістэмы быў і застаецца галоўным суб'ектам чалавек – аўтар, ствральнік і транслятар дакументаваных ведаў, бібліяграфічных рэсурсаў і паслуг. Пры асвятленні сутнасных функцый бібліяграфіі / бібліяграфічнай інфармацыі важна паказаць, што іх стабільнасць і вонкавая нейтральнасць утрымліваюць глыбінны гуманістычны сэнс. Падкрэсліваючы тое, што гэтыя функцыі забяспечваюць функцыянаванне бібліяграфічнага сацыяльнага інстытута, варта звярнуць увагу і на праяўленне ў іх глыбінных гуманітарных каштоўнасцяў з акцэнтам на праяўленні ў ацэначнай (каштоўнасна арыентаванай сацыякультурнай) функцыі. Пры разглядзе прыкладных сацыяльных функцый бібліяграфіі раскрываюцца іх надзвычай цесныя сувязі з інфармацыйнымі патрэбнасцямі карыстальнікаў у розных сферах і галінах дзейнасці, звяртаецца ўвага на зменлівасць гэтых функцый пад уплывам знешніх грамадскіх фактараў. Садзейнічанне папулярызацыі навуковых ведаў, аксіялагічныя, навука-метрычныя і іншыя шматлікія сацыяльныя функцыі бібліяграфіі важна раскрываць і ў ракурсе гуманістычных ідэалаў: шматграннасці чалавека і яго інтарэсаў і патрэб у свеце ведаў і інфармацыі, яго актыўнасці ў соцыуме, праве свабоды выбару крыніц ведаў, далучэння да маральных сэнсаў, дасягненняў культуры і інш. Гэта гуманістычная аснова ў прафесійным светапоглядзе будучага бібліятэкара можа адыграць станоўчую ролю пры стварэнні бібліяграфічных рэсурсаў, змест і методыка якіх сведчаць аб грамадзянскай адказнасці. Паняцце грамадзянскай адказнасці

бібліятэкара, узятае з дакументаў Адукацыйнай камісіі Рэчы Паспалітай, мы лічым прыдатным для канцэнтраванага выражэння гуманістычнага светапогляду бібліятэчнага спецыяліста і ў нашы дні [5].

Дыгіталізацыя, якая хутка і эфектыўна развіваецца ў бібліяграфіі, дазволіла стварыць раней неймаверныя па аб'ёмах і сэрвісах бібліяграфічныя рэсурсы, новыя інструменты збору, аналізу, апрацоўкі і распаўсюджання бібліяграфічнай інфармацыі. Тэндэнцыі глабальнага ўзроўню далі магчымасць больш дакладна адлюстраваць ролю гуманістычных каштоўнасцяў у электроннай (лічбавай) бібліяграфіі ў межах агульнабібліяграфічных дысцыплін. Дыгіталізацыя практычнай бібліяграфічнай дзейнасці ва ўсёй яе грамадскай інфраструктуры, у тым ліку бібліятэках, адкрыла той патэнцыял бібліяграфіі, які не мог быць рэалізаваны на папярэдніх гістарычных этапах. Мы звяртаем увагу студэнтаў на ўзрастанне кагнітыўнага, пошукавага і камунікатыўнага патэнцыялу дыгілітазаваных бібліяграфічных рэсурсаў, як, напрыклад, узбагачэнне структуры бібліяграфічнага запісу, яго інструментальнай ролі ў звязванні дакументаў, тэкстаў, аўтараў па мностве прыкмет, лічбавыя інавацыі ў пошуку і візуалізацыі бібліяграфічных даных, доступе да тэкстаў і інш. Усе яны ў больш высокай ступені забяспечваюць роўны і свабодны доступ да бібліяграфічнай інфармацыі без пpacторавых абмежаванняў фондамі асобных бібліятэк, рэгіянальнымі межамі. Дыгіталізаваныя бібліяграфічныя рэсурсы і паслугі застаюцца для карыстальнікаў практычна бясплатнымі на большасці інфармацыйна-камунікатыўных платформаў соцыума, якія спецыялізуюцца на бібліяграфічным мадэляванні фіксаваных ведаў. І гэтым найперш вызначаюцца сучасныя бібліятэчныя, архіўныя, улікова-рэгістрацыйныя і некаторыя іншыя інстытуцыянальныя віды бібліяграфіі (у параўнанні з навукова-інфармацыйнай ці выдавецкай бібліяграфіяй). Гэтыя з'явы бібліяграфіі перыяду лічбавых камунікацый характарызуюцца ў тэмах адпаведных раздзелаў вучэбных дысцыплін «Бібліяграфазнаўства. Гісторыя», большасці тэм «Арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфічнай работы».

Сёння набыла актуальнасць праблема, якая недастаткова знаходзіла сваю рэалізацыю ў агульнабібліяграфічных і ў іншых інфармацыйна-рэсурсных дысцыплінах, што змяшча-

юць бібліяграфічны кампанент, – гэта развіццё ў студэнтаў уменняў інфармацыйна-аналітычнай дзейнасці, каштоўнаснай разгорнутай бібліяграфічнай пісьмовай і вуснай характарыстыкі асобных дакументаў, іх вызначаных сукупнасцяў і размяшчэння, выкарыстання створаных на гэтым грунце бібліяграфічных прадуктаў і паслуг у сацыяльных сетках. Запатрабаванасць у дадзеных формах прамоцыі фіксаваных ведаў у сацыяльных медыя высокая, аб чым сведчаць наведванні кантэнту, які прысвечаны кніжнай і АВ-прадукцыі. Спрыяльнай для рэалізацыі гэтага кірунку ў падрыхтоўцы бібліятэчных спецыялістаў з'яўляецца і інтэграцыя бібліяграфічнай інфармацыі з фактаграфічнай, паўнатэкставай, візуальнай і іншымі відамі інфармацыі – з'ява, якая інструментальна дапамагае бібліятэкару ўздзейнічаць на пашырэнне кругагляду і ведаў карыстальнікаў.

Такім чынам, лічбавізацыя як глабальны цывілізацыйны трэнд трансфармуе, з аднаго боку, змест бібліятэчнай прафесіі і выкладаемых вучэбных дысцыплін. Разам з тым, з другога – яна ўзбагачае магчымасці, дае новыя арыенціры прафесійнай падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, фармавання іх універсальных і прафесійных кампетэнцый на аснове гарманізацыі гуманітарна арыентаванага і інфармацыйна-тэхналагічнага падыходаў да выкладання спецыяльных дысцыплін.

---


1. *Гендина, Н. И.* Цифровизация библиотечно-информационной деятельности и библиотечного образования: технократические и гуманитарные компоненты / Н. И. Гендина // Вестн. Кемеров. гос. ун-та культуры и искусств. – 2020. – № 52. – С. 170–181.

2. *Зыгмантович, С. В.* Подготовка специалистов библиотечно-информационной сферы для работы в цифровой среде: ожидания работодателей / С. В. Зыгмантович // Материалы VIII Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры» на тему «Библиотеки в условиях пандемии: новые возможности, новые решения», Минск, 21–22 окт. 2021 г. / Нац. б-ка Беларуси. – Минск, 2021. – С. 89–96.

3. Исследовать тенденции и пути развития библиотечно-информационного образования в век цифровых технологий: отчет о НИР (заключ.) / рук. темы Ю. Н. Галковская ; Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск, 2021. – 490 с. – № ГР 20210844.

4. Проектирование компетентностной модели выпускника по специальности «Библиотечно-информационная деятельность» / Ю. Н. Галковская, С. В. Зыгмантович, Е. Ю. Козленко [и др.] ; М-во культуры

Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2020. – 285 с.

5. *Саітава, В. І.* Бібліяграфія на беларускіх землях як частка інфармацыйных працэсаў Рэчы Паспалітай у перыяд 1569–1794 гг. / В. І. Саітава, Т. В. Страмужэўская // Здабыткі : дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Мінск, 2007. – Вып. 9. – С. 25–39.

6. *Соколов, А. В.* Библиография как гуманистическая инфраструктура информационного общества / А. В. Соколов, Т. Ф. Берестова // Библиография. – 2014. – № 1. – С. 58–66; № 2. – С. 37–53; № 3. – С. 72–88; № 4. – С. 19–32; № 5. – С. 44–57.

7. *Степанов, В. К.* Манифест библиотек цифровой эпохи [Электронный ресурс] / В. К. Степанов. – М., 2014. – 15 с. – Режим доступа: http://www.calameo.com/read/0034547383b7da70af379. – Дата доступа: 06.01.2022.

8. *Столяров, Ю. Н.* Гуманизм и технократизм: сближение позиций / Ю. Н. Столяров // Университетская книга. – 2013. – № 5. – С. 40–42.

УДК 379.821:792]:[378.09:304]

***А. В. Калашникова,***
*доцент кафедры менеджмента социально-культурной деятельности учреждения образования «Белорусский государственный университет культуры и искусств»*

## ИВЕНТ-ТЕХНОЛОГИИ КАК ИНСТРУМЕНТ ФОРМИРОВАНИЯ КОРПОРАТИВНОЙ КУЛЬТУРЫ В АКАДЕМИЧЕСКОЙ ГРУППЕ НА КАФЕДРЕ МЕНЕДЖМЕНТА СКД

**Аннотация.** В статье рассматривается процесс формирования корпоративной культуры в Белорусском государственном университете культуры и искусств, обосновывается педагогический потециал ивент-технологий в работе куратора и активизации творческого и воспитательного процесса в студенческой группе.

**Ключевые слова:** событийные коммуникации, ивент-технологии, корпоративная культура университета, ивент-проекты, куратор, ивент-банк.